# МЕТОДЫКА І ВОПЫТ

*Постаці*

Аліна САБУЦЬ,
кандыдат філалагічных навук

## “ЗАСЕЯЦЬ ЗЕРНІ СВЕТЛАЙ ДАБРЫНІ…”: АКТУАЛІІ ТВОРЧАГА ВОПЫТУ ПЕДАГОГА АЛЕНЫ РУЦКАЙ

*Павінен сэрцам падлічыцца дзень,*
*І кожны крок, і кожная хвіліна.*
*Ні ў чым не абясцэніцца нідзе*
*Ўсё тое, што пасля сябе пакінеш.*

*Павінен жыць крылаты свет надзей,*
*І шчасця будзе вокам не акінуць –*
*Трымае вера светлая людзей*
*У прызначэння зорную часіну.*

Менавіта ў цеплыні людскіх сэрцаў, подыху светлых пачуццяў бачыцца місія чалавека ў разуменні Алены Руцкай, педагога, метадыста, выдатніка народнай асветы Беларусі (1982), заслужанага настаўніка Беларусі (1987), паэтэсы, літаратуразнаўцы, перакладчыцы, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі (1985). Пра гэта – вынесеныя ў эпіграф радкі яе верша “Прызначэнне”, іншых вершаў, мноства арыгінальных артыкулаў, вучэбна-метадычных дапаможнікаў для настаўнікаў і студэнтаў, навукова-папулярных выданняў…“*Зразумець сваё сэрца*” – вось творчае крэда сапраўднага педагога, які не дапусціць ніводнай фальшывай ноты ні ў радку, ні ў пачуцці, ні ў позірку.

Студзень 2025 г. знакавы для Алены Вітальеўны юбілейнай урачыстасцю. Нарадзілася яна 11 студзеня 1950 г. у сям’і служачых. Вершы пачала пісаць у першым класе, дэбютавала ў 1964 г. у часопісе “Бярозка” (зусім нядаўна гэтае мастацка-грамадскае выданне адсвяткавала стагоддзе). Закончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1971), дзе стала членам літаратурнага аб’яднання “Узлёт”, якім кіраваў вядомы беларускі паэт, літаратуразнаўца Алег Лойка. Працавала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў СШ № 2 г. Слоніма, з 1993 да 2018 г. – дацэнтам кафедры беларускай літаратуры, кафедры беларускай філалогіі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Цяпер – метадыст СШ № 12 г. Гродна.



Алена Руцкая – аўтарка паэтычных зборнікаў “Сцяжыны” (1983), “Роздум” (1988); падборкі яе вершаў змяшчаліся ў зборніках “Свет вачыма дзяцей”, “Напісалі кнігу самі”, “Натхненне”, “Універсітэт паэтычны”. Вершы перакладаліся на армянскую, польскую, рускую, туркменскую, украінскую мовы; сама ж паэтэса перакладае з украінскай і рускай. Аўтарка кнігі “Памятныя сустрэчы” (2022) – пераможцы IV абласнога літаратурнага конкурсу рукапісаў імя Цёткі (А. Пашкевіч) у намінацыі “Краязнаўства і публіцыстыка”.

Шчучынская зямля на Гродзеншчыне – той пачэсны выток, які шчодра ўдыхнуў багавейную любоў да свайго, радзіннага, хатняга ў будучую настаўніцу, філолага, прызнанага метадыста А. Руцкую. Месцам першых яркіх успамінаў Алена Вітальеўна называе хутар Дзякоўцы на Шчучыншчыне. Адсюль заўсёды мажорныя акорды чароўнай паэзіі жыцця: "*Край дзяцінства, мой сіні птах, / Успамінам цябе пакідаю...*" Пекнай мілатой сагрэты лірычныя радкі паэмы "Вытокі": з аповедаў родных розных пакаленняў з роду Руцкіх ткаўся непадкупны сувой мудрай навукі жыцця."*Выплываюць светлыя цені / Тых, што складваліся ў мяне...*" – прызнаецца паэтэса, для якой непахісным жыццёвым вымярэннем застаецца хрысціянскі запавет:

*Жыві,*
*твары і мудрасць продкаў ведай:*
*Пасей дабро – тады пажнеш дабро.*

Культ кнігі, пашана да яе ў бацькоўскай хаце, вядома ж, наканавалі звязаць лёс з яе вялікасцю Філалогіяй, якая спасцігалася ў Мінску, горадзе маладосці і рамантыкі, паэтычнага ўзлёту; у Слоніме, горадзе культурна-асветніцкага настаўніцкага вопыту; у Гродне, горадзе навукова-творчага сталення, мудрасці... Але не геаграфічная траекторыя вызначае лёс асобы, а пакліканне, магічнае трохзор'е, якое асвятляла шлях педагога і паэтэсы праз *сустрэчы*.

"Памятныя сустрэчы" – кніга нарысаў-эсэ А. Руцкай, у якой сабраны творчыя партрэты знакамітых пісьменнікаў, навукоўцаў, літаратуразнаўцаў Прынёманскага краю (гэта Зоська Верас і Максім Багдановіч, Цётка і Анатоль Іверс, Аляксей Карпюк і Алег Лойка, Іван Лепешаў, Ігар Жук і Аляксей Пяткевіч), а таксама ўспаміны пра Максіма Танка і Уладзіміра Бутрамеева, чые асобы паўплывалі на светаўспрыманне аўтаркі кнігі або мелі дачыненне да яе родных мясцін. "*Усе гэтыя сустрэчы яскрава захаваліся ў памяці, якая вяртае іх, дапамагаючы стаць занатаванымі радкамі ўспамінаў*" [3, с. 4], – прызнаецца пісьменніца ў прадмове да кнігі. І сапраўды, успаміны як адзін з інтымных жанраў мемуарыстыкі вяртаюць чытача да павагі гістарычнай памяці, да ўшанавання творчага дыялогу класікаў і сучаснікаў, урэшце да актуалізацыі пазнання і сваёй самасці ў сённяшнім свеце.

Педагагічны вопыт літаратуразнаўцы выяўляецца не толькі веданнем спецыфікі прафесіі, яе тэхналогіі, але і наяўнасцю мастацкага густу ў гармоніі з самымі рознымі варункамі інфармацыйнай прасторы, неверагодных запатрабаванняў часу. Навуковая выверанасць і грунтоўнасць, памяркоўнасць і патрабавальнасць А. Руцкай як дасціпнага педагога і метадыста, дапытлівага краязнаўцы адчуваецца ў радках згаданай кнігі "Памятныя сустрэчы". Так пачынаецца артыкул пра Цётку (Алаізу Пашкевіч) як падзвіжніцу асветніцкай справы: "*Здаўна відавочная ісціна, што інтэлектуальны, творчы і духоўны патэнцыял любой краіны залежыць непасрэдна ад адукацыі, ад яе прыярытэтнага значэння, формы, стану, тэхналогій. У нас на сённяшні дзень ідзе станаўленне сістэмы адукацыі, арыентаванай на ўваходжанне ў сусветную прастору. Чытаючы сучасныя публікацыі па педагогіцы і методыцы, прыемна ўражваешся таму, як пашырылася геаграфія трансляцыі вопыту, як абазнана прадстаўляюцца погляды замежных педагогаў. Але адначасова становіцца крыўдна, што не згадваецца не менш вартаснае сваё, асабліва, калі запазычаныя ідэі і тэхналогіі ў пэўных напрамках і аспектах перагукваюцца ці супадаюць з айчыннымі напрацоўкамі.* <...> *У літаратуру Цётка прыйшла менавіта з народнай школы, таму ўсе праблемы народнай школы былі ёй блізкімі і вядомымі*" [3, с. 5]. І далей – з доказнай, бясспрэчнай аргументацыяй дасведчаны літаратуразнаўцаметадыст даводзіць пра клопат нашай землячкі – Цёткі – аб выхаванні нацыянальнага патрыятызму: «...*Цётка пазбягала напышлівых, безаблічна агульных заклікаў. Беспамылковым педагагічным чуццём абірала новы плённы падыход, імкнулася ўзрасціць патрыятызм, які пачынаецца з дбання аб кожнай кветцы, аб кожным дрэўцы, пачынаецца з "маёй" хаты, рачулкі, мястэчка, перарастаючы ў патрыятызм маёй Бацькаўшчыны*» [3, с. 8]. Гэтая віртуальная сустрэча-дыялог далікатнага педагога А. Руцкай з класічнай творчасцю першай беларускай паэтэсы, пачынальніцы навуковай белетрыстыкі для дзяцей, асветніцы – важкая прыступка і ў методыцы выкладання літаратуры, бо акцэнтуе ўвагу на гуманным пачатку літаратуры, яе місіі пераўвасобіць чалавека разумнага ў чалавека гуманнага...

Мастацка-педагагічнае мысленне А. Руцкай вядзе ўдзячных чытачоў (як настаўнікаў, студэнтаў, так і аматараў літаратуры) да новых сустрэч-першаадкрыццяў праз уласныя каштоўныя ўспаміны. Сярод такіх памятных згадак – лёсавызначальныя сустрэчы з арыгінальным паэтам, навукоўцам, выкладчыкам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта А. Лойкам, які першы ацаніў вершы старшакласніцы А. Руцкай, параіў паступаць на філалагічны факультэт, апекаваўся студэнтамі-ўзлётаўцамі ў літаратурным гуртку. Надзвычай кала-

рытна, шчыра апавядае аўтарка эсэ “Першая сустрэча. Алег Лойка – незабыўны настаўнік” і пра непахісную самаахвярнасць Алега Антонавіча як кіраўніка “Узлёту”, і пра непасрэднае творчае станаўленне пачаткоўцаў-літаратараў, і пра новыя, такія дарагія, незабыўныя сустрэчы: «*Якраз першы мой прыход у кагорту ўзлётаўцаў і запомніўся тым, што на сустрэчу быў запрошаны Уладзімір Караткевіч. Алег Антонавіч умеў стварыць асаблівае эмацыйнае поле, умеў “выпытваць” у госця тое, што было важным і карысным для нас. І з гасцямі, і без гасцей размова цякла арганічна, нязмушана, без няёмкіх, бездапаможных паўзаў. Яго клопатам было і запрасіць нас на цікавыя імпрэзы ў будынак саюза пісьменнікаў. Называў гэта жартам: “уліцца ў жывы літаратурны працэс”, але не прамінаў пасля сур’ёзна пагаварыць пра нашы ўражанні*» [3, с. 39]. Недарэмна, відаць, гэтыя першыя сустрэчы захаваліся “*як светлы адбітак у жыцці*”, сведчаннем чаму – запавет Лойкі-Настаўніка: “*…трэба ўглядацца ў мінулае, у жыццё, у час; шукаць, пісаць. І што толькі таленавітае – заўсёды актуальнае…*” [3, с. 44].

Колькі іх, незабыўных, такіх неабходных, важкіх сустрэч, якія спялілі творчы вопыт філолага, педагога-метадыста А. Руцкай, аўтаркі навукова-метадычных дапаможнікаў “Тыдзень беларускай мовы і літаратуры ў школе” (1999), “Пазакласная праца па беларускай літаратуры” (2000), “Методыка выкладання беларускай літаратуры” (2004, 2010, у суаўтарстве), “Беларуская літаратура ў школьным выкладанні” (2006, у суаўтарстве), “Пад ветразем спасціжэння і творчасці: 10 клас (Беларуская літаратура. Факультатыўныя заняткі)” (2010, у суаўтарстве), “Беларуская літаратура: зборнік творчых заданняў” (V–IX, IX–X класы; 2012, у суаўтарстве) і інш. Алена Вітальеўна – актыўная ўдзельніца часовых навуковых калектываў Нацыянальнага інстытута адукацыі, у межах іх праграм падрыхтавала электронныя дапаможнікі для V і X класаў агульнаадукацыйнай школы (2015). У творчай майстэрні А. Руцкай – педагога і метадыста, літаратуразнаўцы і паэтэсы – паразумеліся планы і здзяйсненні, радасці і засмучэнні, пошукі і знаходкі. Гэта дастойна пражыты багаты свет кранальна ранімых, нястомна імклівых пачуццяў. Або, як дзеліцца паэтэса, “*так жыву ў няспыннай трывозе / І натхнёна нешта шукаю…*”. Такім прызнанаму педагогу бачыцца партрэт няўрымслівага настаўніка-падзвіжніка, яго самаахвярная і добраслаўлёная місія “*жыццё адкрываць другому*”:

**НАСТАЎНІКУ**

*У працы не маеш права:*
*На роспач,*
*на слабасць,*
*На стому.*
*Твая пачэсная справа –*
*Жыццё адкрываць другому.*

Як вядучы спецыяліст у галіне методыкі выкладання беларускай літаратуры, Алена Вітальеўна аддае перавагу **інавацыйным тэхналогіям** навучання: эўрыстычнай, праблемнай, праектнай, інтэрактыўнай і інш. І, разам з тым, метадыст А. Руцкая ніколі не адмаўляла **педагогіку пошуку** (найперш – пошуку сябе!), **педагогіку сутворчасці**, таму прапанавала шмат карысных парад, запаветаў, надзвычай актуальных, трапных і нават афарыстычных. Згадаем некаторыя з іх:

“*Школа – мініяцюрны адбітак грамадства*” [4, с. 3];

“*Радасць творчасці і адкрыцця – адзін з самых каштоўных вынікаў у любой справе, а ў справе навучання і выхавання ён каштоўны асабліва*” [4, с. 107];

“*Народнае, мудрае, спадчыннае – вось што ў першую чаргу дапаможа маладым душам не проста стаць відушчымі, але і надзеліць неацэнным дарам прадбачання, духоўнасці*” [2, с. 3];

“*Методыка павінна даць настаўніку вычарпальныя адказы на пытанні: **што? як? для чаго?***” [1, с. 8];

“*Відаць, нельга цалкам пагадзіцца, што ўсё новае – гэта даўно забытае старое, але варта прызнаць, што вопыт – найлепшая аснова для творчых пошукаў*” [2, с. 24].

Сапраўдны педагог не цураецца заўсёднай творчай вучобы. Шырокі гарызонт мыслення, майстэрскае валоданне словам, нязмушаная імправізацыйнасць аповеду – штрыхі адметнага почырку педагога А. Руцкай, якая ўмее ацэньваць і цаніць. Высокае прызнанне заслужылі яе калегі-аднадумцы, гродзенскія навукоўцы. Вывучаць літаратуру як мастацтва слова – галоўны прынцып выкладання літаратуры ў разуменні вядомага прафесара мовазнаўцы Івана Лепешава – па прызнанні А. Руцкай, яго ўрокі “*перасцераглі ад павярхоўнага, фармальнага ўспрымання інавацый*” [3, с. 50]. Вартая ўвагі і вучоба ў калегі па кафедры беларускай літаратуры, літаратуразнаўцы, прафесара Ігара Жука: вопытнаму педагогу А. Руцкай імпануюць ягоныя “*імунітэт ад модных павеваў і ад укаранелых догмаў*”, “*наватарства як духоўнае самавыяўленне, як мастацкі рух на аснове законаў высокай эстэтыкі… унікальны інтуітыўны*

*тып мыслення, аналітычнае і падсвядомае адчуванне вартаснага, таленавітага і нават дар прадбачання*" [3, с. 54–55]. Як былая слухачка настаўніцкіх курсаў, а пасля каляжанка па ўніверсітэце, А. Руцкая вучылася ў вядомага краязнаўцы, літаратуразнаўцы, прафесара Аляксея Пяткевіча манеры чытання лекцый, пра што апавядае: "*Помніцца, ён любіў уцягваць слухачоў у абмеркаванне, у дыскусію. Такім чынам ён вучыў выхоўваць удумлівага чытача, паказваючы, як спасцігаць таямніцы мастацкага твора, бачыць сутнасць вобразаў, вылучаць глыбіннае ў аўтарскай задуме*" [3, с. 60]. З успамінаў А. Руцкай, адна з дыскусій згаданага прафесара з настаўнікамі "*стала першым крокам да разумення праблемнай тэхналогіі выкладання літаратуры, да якой у школе звярнуліся значна пазней*" [3, с. 61].



**Абмеркаванне з вучнямі СШ № 12 г. Гродна зборнікаў паэзіі ў рамках праекта "Чытаем разам".**

"*Мне вельмі пашчасціла на настаўнікаў: тых, што вучылі мяне, і тых, з якімі поруч пасля працавала. Адданасць сваёй справе, творчы падыход, заўсёдны пошук новага, больш дасканалага – гэта вызначала іх і стала прыкладам для мяне. З шасці год я сустракаю верасень пад мелодыю школьнага званка і заўсёды ўдзячна ўспамінаю маіх настаўнікаў*", – годна, з пачуццём прыязнасці заяўляе Алена Вітальеўна ў размове з аўтарам артыкула. Пра гэта шчыруе Руцкая-педагог і ў вершы-прысвячэнні:

**МАІМ НАСТАЎНІКАМ**

*Настаўнікі мае,*
*ад першай школьнай сцежкі*
*да развітальнай песні*
*апошняга званка*
*Вы сустракалі нас*
*святлом сваёй усмешкі,*
*што надавала сілы*
*імкнуцца і шукаць.*
*Настаўнікі мае,*
*прасторамі навукі*
*цярпліва нас вялі,*
*каб выбралі душой*
*мы справу па сабе*
*і ў радасць, без прынукі*
*жылі ёй, не зазнаўшы*
*ні жаль, ні неспакой.*
*Настаўнікі мае,*
*у горкім шкадаванні*
*вы прабачалі нам,*
*што слушнасць вашых слоў*
*злятала, нібы пыл…*
*І як з наканаваннем,*
*з гаркотаю праблем*
*да Вас ішлі ізноў.*
*Настаўнікі мае,*
*зноў верасень згадае –*
*той самы незабыўны*
*і самы светлы час.*
*Вы засталіся там…*
*І памяць нас гукае*
*залівістым званком*
*у наш прасторны клас.*

Можа быць, таму Алена Руцкая неяк асабліва любіць восень ("*Я за мудрасць восень люблю…*") – пару́ школьных званкоў і пару́ жаночай сентыментальнасці, пару́ гармоніі фарбаў і гукаў, што зліваюцца ў акварэльна-меладычны "пейзаж душы". Калі памяць мроіць павуцінкай, усплывае ў лістабоі радасці і журбы… Але ж "*пражытых дзён уладны лістапад / шчаслівых сцежак замясці не можа*".

Хай зорны шлях вядомага беларускага педагога Алены Руцкай і надалей будзе асвечаны нястомным метадычным пошукам, плённай літаратурна-творчай дзейнасцю, новымі сакавітымі вершамі на роднай мове.

**Спіс літаратуры**

1. **Руцкая, А. В.** Методыка выкладання беларускай літаратуры : вучэб. дапам. / А. В. Руцкая, М. У. Грынько. – Мінск : Изд-во Гревцова, 2010. – 184 с.
2. **Руцкая, А.** Пазакласная праца па беларускай літаратуры : дапам. для настаўнікаў / А. Руцкая. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 164 с.
3. **Руцкая, А. В.** Памятныя сустрэчы / А. В. Руцкая. – Гродна : ЮрСаПрынт, 2022. – 84 с.
4. **Руцкая, А. В.** Тыдзень беларускай мовы і літаратуры ў школе / А. В. Руцкая. – Гродна, 1999. – 107 с.